– формирование профессионально ориентированной правовой компетенции библиотекаря-библиографа – это комплексный педагогический процесс целенаправленного развития специальных профессионально востребованных знаний и умений в области правового обеспечения деятельности библиотек, позитивного ценностного отношения к правовым положениям, регулирующим правоотношения в сфере деятельности библиотек, мотивации деятельностно-легитимного поведения в процессе профессиональной деятельности, устойчивого стремления к актуализации профессионально ориентированных правовых знаний, умений и опыта.


1. *Карева, А. В.* Формирование педагогико-правовой компетенции в профессиональной подготовке специалистов по сервису и туризму : дис. ... канд. пед. наук : 13.00.08 / А. В. Карева. – Екатеринбург, 2009. – 241 л.

2. *Горбушина, М. В.* Формирование правовой компетентности у будущих специалистов социальной работы в процессе профессиональной подготовки в вузе : дис. ... канд. пед. наук : 13.00.08 / М. В. Горбушина. – Ульяновск, 2007. – 210 л.

3. *Коротун, А. В.* Формирование правовой компетенции у будущих социальных педагогов в процессе профессиональной подготовки : дис. ... канд. пед. наук : 13.00.08 / А. В. Коротун. – Екатеринбург, 2010. – 279 л.

4. *Матульскі, Р. С.* Вышэйшая бібліятэчная адукацыя: здабыткі і праблемы / Р. С. Матульскі // Чалавек. Культура. Інфарматыка : матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск, 7–8 снеж. 1999 г. / Беларус. ін-т праблем культуры ; навук. рэд. У. П. Скараходаў. – Мінск, 2003. – С. 37–38.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


***С. В. Гаўрылава,***
*саіскальнік*


## АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў ДАКУМЕНТАВАННІ СУЧАСНАСЦІ КРАЯЗНАЎЧЫМІ МУЗЕЯМІ БЕЛАРУСІ

Дакументаванне сучаснасці – найважнейшая сацыяльная функцыя музея, якая заключаецца ў захаванні гісторыка-культурнай спадчыны, стварэнні базы крыніц для навукова-даследчай і экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці. Сучасныя рэаліі вельмі хутка становяцца гістарычнымі фактамі і патэнцыяльнымі помнікамі гісторыі і культуры, таму праблемам рэалізацыі функцыі дакументавання сучаснасці прысвечаны не адзін

навуковы артыкул. Да гэтай тэмы ў сваіх даследаваннях звярталіся З. Вардан, П. ван Менш, У. Дукельскі, У. Кандрацьеў, В. Божчанка, М. Бяспалая і інш.

Дакументаванне ўвогуле, як і дакуметаванне сучаснасці ў прыватнасці, уяўляе сабой мэтанакіраванае адлюстраванне ў музейным зборы з дапамогай музейных прадметаў разнастайных фактаў, падзей, працэсаў і з’яў, якія адбываюцца ў грамадстве і прыродзе [2, с. 13]. Мэтанакіраванасць гэтага працэсу закладзена ў місіі музея і навуковай канцэпцыі камплектавання музейных фондаў [6, с. 54]. Як паказвае практыка, супрацоўнікі краязнаўчых музеяў абапіраюцца збольшага на перспектыўны план камплектавання, што адлюстроўвае тэмы, па якіх вядзецца папаўненне фондаў, у тым ліку і прадметамі сучаснасці. У той жа час апошняе не заўсёды выдзяляецца як асобны накірунак і не прапісваецца ў планах камплектавання.

У апошнія дзесяцігоддзі змясціліся акцэнты ў выкарыстанні розных формаў камплектавання фондаў. Праведзенае апытанне супрацоўнікаў асобных краязнаўчых музеяў Віцебскай і Мінскай абласцей паказала, што, напрыклад, экспедыцыі ўжо амаль не ладзяцца, і тлумачыцца гэта праблемамі фінансавання. Па той жа прычыне ў многіх музеях не праводзіцца закупка прадметаў сучаснасці. У сувязі з гэтым сёння на першы план выйшла такая форма, як прыняцце прадметаў у дар. Практыка дарэння прадметаў музею набывае сёння форму акцыі. Пад рознымі назвамі такія акцыі ладзілі краязнаўчыя музеі Сянно, Полацка, Віцебскі абласны краязнаўчы музей і інш. Перадача прадметаў на бязвыплатнай аснове, да прыкладу, калі пасля правядзення персанальнай выстаўкі аўтар перадае музею асобныя творы, часта вырашае праблему набыцця музеямі твораў сучаснага мастацтва.

Як адзначылі музейшчыкі, у выпадку закупкі перавага аддаецца прадметам, музейнае значэнне якіх не выклікае сумненняў, а гэта ў асноўным прадметы старажытнасці і пачатку ХХ ст., у той час як крытэрыі адбору прадметаў сучаснасці па сённяшні дзень дакладна не вызначаны. На тое, каб ацаніць тую ці іншую падзею ці з’яву, прааналізаваць і ўвесці даныя ў навуковы абарот, гісторыкам патрабуецца некаторы час; па гэтай прычыне дакументаванне сучаснасці ў музеях апярэджвае развіццё гістарычнай навукі. У гэтых адносінах сучасныя музеі ствараюць тую базу крыніц, на аснове вывучэння якой у да-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лейшым будуць грунтавацца навуковыя даследаванні не толькі музейных супрацоўнікаў.

Жаданнем найбольш поўна задакументаваць важную для рэгіёна падзею абумоўлены збор матэрыялаў «па гарачых слядах», які ў сучасных краязнаўчых музеях праводзіцца тэматычнымі комплексамі, а не адзінкавымі прадметамі.

Комплексны профіль краязнаўчага музея стварае дадатковыя цяжкасці ў камплектаванні матэрыяламі сучаснасці: склад фондаў такіх музеяў мае разгалінаваную структуру, што ўключае разнапланавыя калекцыі. Супрацоўнікі краязнаўчых музеяў павінны не толькі мець высокі ўзровень ведаў па профільных навуках, але і валодаць інфармацыяй аб паўнаце складу той ці іншай калекцыі. Пагодзімся з даследчыкамі, якія сцвярджаюць, што простага запаўнення прабелаў у складзе фондаў недастаткова. У камплектаванні фондаў краязнаўчых музеяў, якія рэпрэзентуюць сацыякультурнае развіццё вызначаных рэгіёнаў, побач з агульнымі крытэрыямі адбору прадметаў павінен улічвацца прынцып мемарыяльнасці [1, с. 7]. На практыцы менавіта гэты прынцып часта становіцца вызначальным пры адборы ў фонды прадметаў, асабліва па савецкім перыядзе, адрознай рысай якіх з’яўляецца іх тыповасць. Тыповасць прадмета, што суадносіцца з яго функцыянальна-атрыбутыўнымі якасцямі, і ўнікальнасць, якая суадносіцца з суб’ектыўнымі ўяўленнямі аб прадмеце (мемарыяльнасць, сімвалічная абумоўленасць і інш.), зліваючыся, узмацняюць рэпрэзентатыўнасць прадмета [3, с. 43].

Краязнаўчы музей уяўляе сабой цэнтр навуковага дакументавання рэгіёна, цэнтр вывучэння, захавання і прэзентацыі спадчыны невялікай лакальнай тэрыторыі. Расійскі музеёлаг А. Масцяніца выдзяляе два ўзроўні, на якіх адбываецца ўзаемадзеянне музея і гісторыка-культурнай спадчыны. Мэтанакіраваны пошук, збор прадметаў і сістэматычнае камплектаванне фондаў адбываецца на эўрыстычным узроўні. Гнасеалагічны ўзровень звязаны з вывучэннем сабранага матэрыялу, асэнсаваннем зробленых у працэсе ўсебаковага вывучэння прадмета адкрыццяў; атрыманая інфармацыя ўводзіцца ў навуковы абарот, адбываецца прырашчэнне новых ведаў [4]. Калі ў савецкі час музейныя прадметы разглядаліся з пазіцыі магчымасці іх выкарыстання для ілюстрацыі агульнапрынятых уяўленняў пра рэальнасць, якую яны рэпрэзентуюць, у сувязі з чым мела мес-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ца аслабленне ўласна даследчыцкага складніка функцыі дакументавання [5, с. 241–242], то ў сённяшняй дзейнасці музеяў па дакументаванні сучаснасці назіраецца сталае імкненне разглядаць музейныя прадметы ў якасці крыніц інфармацыі для вывучэння рэпрэзентаванай імі рэальнасці.

Працэс дакументавання працягваецца ў экспазіцыйнай і адукацыйнай дзейнасці музея. Экспазіцыя ў гэтым плане ўяўляе сабой своеасаблівую, спецыфічную для музея форму «публікацыі» навуковай работы [7, с. 49]. Работа, якую праводзяць супрацоўнікі краязнаўчых музеяў і на эўрыстычным, і на гнасеалагічным узроўні, знайшла сваё ўвасабленне ў экспазіцыях многіх музеяў. Так, напрыклад, у Віцебскім раённым і Бешанковіцкім музеях з'явіліся комплексы – інтэр'еры савецкай кватэры; у Браслаўскім, Талачынскім, Чэрвеньскім і іншых музеях – раздзелы, прысвечаныя знакамітым землякам – сучасным дзеячам культуры і мастацтва. Вялікай папулярнасцю як сярод саміх музейшчыкаў, так і ў наведвальнікаў карыстаюцца выстаўкі па савецкім перыядзе разнастайнай тэматыкі: мода, ёлачныя цацкі, віншавальныя паштоўкі і г. д. У той жа час ні ў адным краязнаўчым музеі Віцебскай і Мінскай абласцей не створаны паўнавартасныя экспазіцыі па гісторыі 2-й пал. XX – пач. XXI стст.

Такім чынам, музей фарміруе стаўленне грамадства да гістарычнай і культурнай спадчыны, яе ацэнку, успрыманне, разуменне, чаму спрыяе рэалізацыя функцыі дакументавання – функцыі доказу, г. зн. пацвярджэння пры дапамозе музейных прадметаў развіцця грамадства, культуры, прыроды, што адбываецца няспынна. У сувязі з гэтым важнае значэнне набывае дакументаванне сучаснага перыяду, у адлюстраванні якога, у параўнанні з іншымі гістарычнымі перыядамі, супрацоўнікі краязнаўчых музеяў маюць значна большыя магчымасці. На сённяшні дзень гэты працэс у асноўным немэтанакіраваны, што выклікана як адсутнасцю дастатковага фінансавання, распрацаванага падмурка з боку гістарычнай навукі, так і навуковых канцэпцый камплектавання і работы па стварэнні новых экспазіцый у саміх краязнаўчых музеях. Нягледзячы на нявызначанасць крытэрыяў адбору прадметаў сучаснасці, музейшчыкі імкнуцца задакументаваць важныя для гісторыі краіны і рэгіёна падзеі «па гарачых слядах», а да пошуку матэрыялаў прыцягваюць мясцовае насельніцтва, арганізуючы спецыяль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя акцыі дарэння. Характэрная для постсавецкага перыяду тэндэнцыя запаўняць прабелы ў фондавых зборах змянілася кірункам у бок вывучэння назапашаных калекцый і прадстаўлення наведвальнікам вынікаў навукова-даследчай дзейнасці ў выглядзе тэматычных комплексаў і выставак.

1. *Бяспалая, М. А.* Сучасныя тэндэнцыі ў камплектаванні фондаў рэгіянальных музеяў як працяг традыцый Я. і К. Тышкевічаў / М. А. Бяспалая // Чацвёртыя Тышкевіцкія чытанні (г. Валожын, 24 кастрычніка 2012 г.) : матэрыялы чытанняў / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. – Мінск, 2012. – С. 5–16.

2. *Галкина, Т. В.* Краткий словарь музейных терминов (для студентов исторических факультетов педагогических университетов по специализации «Историческое краеведение и музееведение») // Т. В. Галкина, О. О. Петунина. – Томск : Изд-во Томского государственного педагогического университета, 2004. – 16 с.

3. *Кондратьев, В. В.* Вопросы отбора материалов современности в музейное собрание / В. В. Кондратьев // Формирование и изучение музейных коллекций по истории советского общества : сб. науч. тр. / Центр. музей революции СССР ; [редкол.: Ю. П. Пищулин (отв. ред.) и др.]. – М. : [Б. и.], 1982. – С. 38–46.

4. *Мастеница, Е. Н.* Культурное наследие и музей: проблема взаимодетерминации / Е. Н. Мастеница // Музеология. Культурология [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.bvahan.com/museologypro/muzeevedenie.asp?li2=1&c_text=42. – Дата доступу : 20.10.2015.

5. *Ольшевская, Г. К.* Новые критерии комплектования музейных фондов. Историко-антропологический подход / Г. К. Ольшевская // Исторические экспозиции региональных музеев в постсоциалистический период : сборник материалов Международного семинара, проведенного в 2003–2004 гг. в России, Белоруссии и Германии / И. В. Чувилова (отв. ред.). – СПб. : Алетейя, 2009. – С. 241–246.

*6.* Словарь актуальных музейных терминов // Музей. – 2009. – № 5. – С. 47–68.

7. *Шляхтина, Л. М.* Основы музейного дела: теория и практика : учеб. пособие / Л. М. Шляхтина. – 2-е изд. стер. – М. : Высш. шк., 2009. – 183 с. : ил.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ